Вераніка ЯРМАЛІНСКАЯ

# АД РЭПЕТЫЦЫІ – ДА СПЕКТАКЛЯ

**Клас-канцэрт студэнтаў кафедры тэатральнай творчасці Беларускага універсітэта культуры**

Кафедра тэатральнай творчасці Беларускага універсітэта культуры не перастае здзіўляць і радаваць сваіх удзячных гледачоў. Кожная яе справаздача не падобная адна на адну, ніколі не паўтарае раней вынайдзеныя прыёмы, рэжысёрскія пабудовы. І таму кожны раз перад намі — новы спектакль, які вырастае на вачах, нараджаецца з рэпетыцыі, імправізацыі, добра падрыхтаванага ўрока.

Трэцяга красавіка ўтульная рэпетыцыйная зала універсітэта была перапоўнена студэнтамі, выкладчыкамі, маладымі артыстамі мінскіх тэатраў. Адным словам, публікай цікавай, прыгожай, захопленай і крыху зачараванай — у цудоўны веснавы дзень, тэатр, шамаценне куліс...

Ужо першы нумар канцэрта быў сустрэты апладысментамі, разумнай цішынёй і нейкай асаблівай узнёсласцю, якая так і лунала ў паветры. У першым нумары (дарэчы, як і ў многіх іншых) быў заняты ўвесь першы курс. Практыкаванні «На вялікай скакалцы» адразу ж узрушылі залу, ажывілі яе. З розных бакоў чуліся падбадзёрванні, апладысменты. Дэманструючы скачкі праз скакалку, студэнты спалучалі іх з разнатэмпавымі моўнымі практыкаваннямі: тэкстам, частушкамі. Было прыемна назіраць за лёгкімі, грацыёзнымі рухамі студэнтаў 115-й групы I курса. Так свабодна і незалежна існавалі яны ў прапанаваных абставінах. Гэтак жа зладжана выконвалі практыкаванні на тэмпа-рытм. Я думаю, што рэжысёр-педагог Галіна Галкоўская ў гэтым выпадку на правільным шляху сваіх пошукаў і задум. Прыгадваюцца словы С. Валконскага, які яшчэ ў пачатку дваццатага стагоддзя так растлумачваў прыроду тэатральнага мастацтва: «Хто мастак? Акцёр — чалавек. Што матэрыял? Акцёр, яго плоць і кроў — чалавек. Што паказваецца, выяўляецца? Дзеючая асоба — чалавек. З гэтых трох: што складае галоўную асаблівасць акцёрскага мастацтва? Безумоўна ж, другое, інакш кажучы, тое, што ў гэтым мастацтве матэрыялам служыць жывы чалавек, а не мёртвы матэрыял. Таму



**Выступаюць: Г. РУДАК, С. СЕРГІЕНКА, Т. ГАРБАЧЭЎСКАЯ**

што чалавек-мастак ёсць ва ўсякім мастацтве, чалавек-адлюстраванне амаль ва ўсякім, але чалавек-матэрыял выключна дасягненне акцёрскага мастацтва...»

Таленавіта прадэманстравала своеасаблівы міні-спектакль «Механічныя лялькі» ўсё тая ж 115-я група І курса. Нечакана, інтрыгуючы, пад «механічную» музыку ўрываўся ў нетаропкую плынь агульнага сцэнічнага дзеяння таямнічы паравоз, які ўтваралі самыя розныя персанажы: Машыніст — М. Яцэвіч, П'еро — А. Джамілашвілі, Каламбіна — А. Прадко, Русалка — А. Антонава, Рыцар — В. Клімовіч, Клоун — М. Васільева, Мядзведзік — В. Крупенька, Цюлень — П. Бандзіч, Пара — Н. Гайдучэнка, В. Шымановіч і іншыя. Група прадэманстравала ўменне працаваць у ансамблі, трымаць адзіны сцэнічны рытм. Студэнты ўдала «высвятлялі» кожны персанаж, удзяляючы галоўную ўвагу руху, жэсту, позірку. А таксама — касцюму, грыму.

Прыцішана, зацікаўлена слухала зала «Маналог» у выкананні студэнткі V курса Н. Пілiпейка, у якім знітаваны ўзнёсла-рамантычны тэкст (урыўкі з твораў Лопэ дэ Вэгі) і музычны нумар. Н. Піліпейка стварала вобраз прывабны, абаяльны, афарбоўвала словы сваёй лірычнай гераіні ў цёплыя, мяккія фарбы. Не забывала пра гумар, лёгкую іронію і мілае какецтва. Моўная характарыстыка выяўляла ў дадзеным выпадку не толькі самую сутнасць вобраза, але і індывідуальнасць выканаўцы. Падкрэслівала яе жаноцкасць, пяшчотнасць, душэўнасць. Хачу зазначыць, што песня ў прапанаваным эцюдзе не гучала сама па сабе. Яна з'яўлялася працягам тэксту, расшыфроўвала вобраз гераіні. Нельга не пагадзіцца з высновай Я. Калманоўскага аб тым, што акцёр, урэшце, можа не валодаць магчымасцю спяваць так, як Аліса Фрэйндліх, але пачуццё музыкі, якая жыве ў спектаклі, водгук на яе нададуць гучанню ролі значныя асаблівасці.

Упершыню ў клас-канцэрце паказаў сябе IV курс майстэрства лялькаваджэння. Невялікі ўрывак «Вясёлыя лялькі» са спектакля «Лялечны тэатр» сыгралі А. Тразубаў і Н. Піліпейка. Яны ператварылі сваё выступленне ў жывы дыялог з глядзельнай залай. З'яўленне лялечнага тэатра адразу ж засведчыла аб свяце, аб тэатральным цудзе, пра якія звычайна марыць глядач, як малы так і дарослы. Блiскучая шырма, дошка, на якой будуць намаляваны твары персанажаў — вось і ўсё няхітрае мастацкае афармленне. Але як усё гэта па-сапраўднаму ажывае, калі на сцэне з'яўляюцца яркія, рознакаляровыя лялькі! Крыху смешныя, нязграбныя, але такія мілыя, даверлівыя, добразычлівыя. Падобны на маленькага дракончыка Карму-Гаў, які спачатку заяўляў, што яму ніхто не патрэбны і што ён сам сабе сябра. Элегантны, артыстычны Гонза адразу ж пакарыў усіх песенькай «Луна». Жыццярадасная дзяўчынка Люсі. Аказваецца, усім ім, як і маладым людзям у зале, неабходна зусім не многа: толькі крышачку цеплыні, узаемаразумення, увагі. І ўсе яны таксама, як і кожны з нас, шукаюць адзінага сябра, якому можна даверыць усе свае думкі, сумненні, лепшую часцінку свайго «я». Невялікі ўрывак лялечнага тэатра ажывіў увесь канцэрт сваёй сапраўднай відовішчнасцю, непасрэднасцю. А. Тразубаў і Н. Піліпейка прадэманстравалі сваё майстэрства шчыра і проста размаўляць з гледачом.



А. ПРАДКО



В. КРУПЕНЬКА

Фота Ул. КРУКА

Запомніліся таксама і яшчэ два нумары: «Пародыя на фанаграмы» і «Сінхроннае плаванне», у якіх былі заняты студэнты III курса А. Рудак, Т. Гарбачэўская, С. Сергіенка, А. Мішын. Гэтыя выступленні па сваёй працягласці займалі няшмат часу, тым не менш іх выканаўцы здолелі паказаць адточанасць рухаў і жэстаў, цікавую пластыку, уменне цудоўна знітоўваць паміж сабой самыя разнастайныя магчымасці акцёрскай прафесіі. Дакладнасць — галоўнае, што трапляе ў поле зроку пасля прагляду дзвюх вышэй названых работ студэнтаў III курса. Узнікае шмат асацыяцый, звязаных з акцёрскай прафесіяй. І як тут не прыгадаць Бертольда Брэхта, якому непасрэдна належаць выдатныя словы пра артыстаў: «Мы нібы ювеліры за работай, кожнаму нашаму руху ўласціва бездакорная дакладнасць і зграбнасць, хаця б зямля гарэла ў нас пад нагамі...» Брэхт патрабаваў ад сучаснага тэатра «асаблівай вытанчанасці, сілы, абаяльнасці жэста», «смелай і прыгожай архітэктонікі моўных формаў».

Прагледзеўшы клас-канцэрт студэнтаў кафедры тэатральнай творчасці, мне падалося, што менавіта гэтага ад кожнай рэпетыцыі да спектакля і дабіваюцца таленавітыя педагогі Беларускага універсітэта культуры: мастацкія кіраўнікі Вячаслаў Цюпа, Уладзімір Залатухін, Мадэст Абрамаў, Рыгор Баравік, Юрый Сохар; рэжысёр-педагог Галіна Галкоўская; педагог па сцэнічнай мове Людміла Старадумава.